*На, тэму дня,*

# МАШТАБНЫ ПЕРАЕЗД

**Чакаць моманту, калі адкрыюцца дзверы новага будынка Нацыянальнай бібліятэкі, засталося ўсяго некалькі месяцаў. Ужо 1 студзеня 2006 года тут прымуць першых чытачоў, пры ўмове што не падвядуць будаўнікі.**

А пакуль супрацоўнікі бібліятэкі рыхтуюць кнігі, дакументы да пераезду. Маштаб работы ашаламляе: патрэбна спачатку запакаваць, потым перавезці і нарэшце расставіць на паліцах, унесці ў каталогі 8,5 мільёна экземпляраў літаратуры і іншых носьбітаў інфармацыі, якія ў дадзеным выпадку маюць рэальнае вагавае вымярэнне — дзве з палова тысячы тон. Дарэчы, больш за палову экземпляраў ужо падрыхтаваны да перамяшчэння.

"У сусветнай практыцы няшмат прыкладаў глабальных пераездаў галоўных бібліятэк краіны, — зазначыў на нядаўняй прэс-канферэнцыі дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Раман Матульскі. — Для нас гэта таксама унікальны вопыт, і мы робім усё для таго, каб захаваць у поўным аб'ёме і не пашкодзіць падчас перамяшчэння фонды нашай бібліятэкі".

У новым "брыльянтавым" будынку галоўнай бібліятэкі прадугледжаны 22 чытальныя залы, у якіх адначасова могуць працаваць дзве тысячы наведвальнікаў. Самі артэфакты пісьменнасці будуць захоўвацца ў велізарным кнігасховішчы, размешчаным на 23 паверхах, прычым спецыяльная сістэма (яе аналагаў няма ў бібліятэках краін СНД) гарантуе дастаўку любой кнігі чытачу за 15 хвілін. Магчымасць карыстання фондамі буйнейшых замежных бібліятэк, базамі даных у сетцы забяспечыць наяўнасць сучасных тэхналогій: у бібліятэцы ўстанаўліваюцца 1,5 тысячы камп'ютэраў, будзе працаваць Інтэрнет-цэнтр.

Аднак у новым абліччы Нацыянальная бібліятэка прэтэндуе не толькі на ролю галоўнага інфармацыйнага цэнтра краіны. "Лепшы будынак краіны патрабуе максімальнага выкарыстання. З усведамлення гэтага нарадзілася канцэпцыя стварэння на базе бібліятэкі рэспубліканскага не толькі інфармацыйнага, але і сацыякультурнага цэнтра," — расказаў Раман Матульскі. Такім чынам у сценах бібліятэкі з'явяцца музейны комплекс, бары і рэстараны, аздараўленчы комплекс, дзіцячы пакой.

**Наталля МЯШКОВА, "МП"**